ПАДЗЕЯ

«XIII ЛИДСКИЕ ЧТЕНИЯ»
«ОСОБЕННОСТИ ПРИРОДЫ ЛИДСКОГО КРАЯ»

# XIII Лідскія чытанні: «Адметнасці прыроды Лідскага краю»

**ЛІДА. У раённым цэнтры адбылася адмысловая навукова-практычная канферэнцыя. Пра свае ўражанні і ўдзел у форуме распавядае ў фотарэпартажы кандыдат у СПБ, пісьменніца-педагог, краязнаўца Наталля АНАШКЕВІЧ.**

Прырода Рэспублікі Беларусь – гэта ўнікальная з’ява. Яна вылучаецца багаццем жывёльнага і расліннага міру. Прырода і чалавек на нашых землях існуюць у гармоніі на працягу ўсяго часу. І існуюць не проста, а ўзаемадапаўняючы адзін аднаго.

Лідскі край – адносна невялікі па сваёй тэрыторыі куток Беларусі, але яго прырода з’яўляецца часткай прыгажосці і багацця нашай краіны. На тэрыторыі Лідскага раёна сёння размешчаны тры асаблівa ахоўныя прыродныя тэрыторыі: біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Дакудаўскі», гідралагічны заказнік мясцовага значэння «Бярэзіна», батанічны помнік прыроды мясцовага значэння «Парк Гарні». Лясы, лугі, палеткі, рэкі, балоты – усё гэта наша спадчына, якая з пакалення ў пакаленне перадаецца чалавекам. І наша агульная задача — захаваць багацце роднай прыроды і перадаць яго нашчадкам.

З гэтай нагоды 16 красавіка ў ДУК «Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы» прайшла навукова-практычная канферэнцыя «XIII Лідскія чытанні», прысвечаная тэме «Адметнасці прыроды Лідскага краю». Для абмеркавання прыроднага багацця рэгіёна мерапрыемства аб'яднала даследчыкаў, краязнаўцаў і эколагаў.

У ліку дакладчыкаў выступілі супрацоўнікі ДУ «Лідскага гісторыка-мастацкага музея», дзяржаўнай лесагаспадарчай установы «Лідскі лясгас», ДУ «Лідскі каледж ГрДУ імя Янкі Купалы», дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Лідскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства», ДУК «Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы», а таксама прадстаўнікі ДУА «Сярэдняй школы № 11 г. Ліды імя Н. І. Паповай».






Аўтар гэтых радкоў, настаўнік рускай мовы і літаратуры, краязнаўца Наталля Мікалаеўна Анашкевіч *(на фота ўверсе)*, увазе ўдзельнікаў канферэнцыі прадставіла матэрыялы свайго даследавання на тэму «Феномены зімы і вясны ў творчасці рускамоўных паэтаў Лідскага краю», а таксама прэзентавала паэтычныя зборнікі «Поэты Лидчины о зиме, или Зимнее настроение», «Весна в стихах, весна в душе», у якія былі сабраныя вершы лідскіх пісьменнікаў, прысвечаныя аднаіменным порам года.



Вучань 9 «А» класа ДУА «Сярэдняя школа № 11 г. Ліды імя Н. І. Паповай» Алефіровіч Матвей пазнаёміў прысутных з творчасцю лідскай пісьменніцы Таццяны Іванаўны Сямёнавай, а менавіта спыніўся на тэме прыроды ў творчасці лідскай паэтэсы.




Кожны дакладчык падзяліўся навуковымі дадзенымі, ідэямі і праектамі, якія дапамогуць у захаванні і рацыянальным выкарыстанні прыродных багаццяў рэгіёна. Выступы і дыскусіі пацвярдзілі, што прырода Лідчыны — сапраўдная каштоўнасць, якую неабходна ахоўваць і захоўваць для будучых пакаленняў. Высновы, зробленыя на навукова-практычнай канферэнцыі, будуць садзейнічаць развіццю прыродаахоўных ініцыятыў, павышэнню экалагічнай свядомасці і ўмацаванню любові да роднай зямлі.

**Наталля АНАШКЕВІЧ**

**На фота:** сярод удзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі «XIII Лідскія чытанні» на тэму «Адметнасці прыроды Лідскага краю» пісьменніца-педагог, краязнаўца Наталля АНАШКЕВІЧ і вучань 9 «А» класа ДУА «Сярэдняя школа № 11 г. Ліды імя Н. І. Паповай» Матвей Алефіровіч. Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы. Красавік 2026 года.


Дзяржаўная ўстанова культуры
"Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы"
Навукова-практычная канферэнцыя
"XIII Лідскія чытанні"
"Адметнасці прыроды
Лідскага краю"


Государственное учреждение культуры
«Лидская районная библиотека имени Янки Купалы»
Уважаемые жители
города Лиды и Лидского района!
Приглашаем Вас принять участие
в научно-практической
конференции
12+
«XIII ЛИДСКИЕ ЧТЕНИЯ»
«ОСОБЕННОСТИ ПРИРОДЫ
ЛИДСКОГО КРАЯ»
16
апреля
2026 года
11:00
Место проведения:
ГУК «Лидская районная
библиотека
имени Янки Купалы»
(г. Лида, ул. Ленинская, д. 10,
конференц-зал, 3 этаж)